***Праверым свае веды.*** 1. Назавіце асноўныя аб’екты палітычнай карты свету. 2. Назавіце асноўныя прасторавыя формы дзяржаў. 3. Якія тэндэнцыі характэрныя для сучаснай палітычнай карты свету?

***Ад простага да складанага.*** 1. Пра якія бягучыя аперацыі ААН вы чулі з інфармацыйных крыніц на працягу апошняга месяца? 2. Падрыхтуйце паведамленне пра служачых міратворчай місіі ААН.

***Падарожжа па Глабальнай сетцы.***

Афіцыйны сайт ААН.

Афіцыйны сайт ААН у Беларусі.

## § 3. Рэгіянальныя і лакальныя канфлікты ў свеце

***Успамінаем.*** Чаму ўзнікаюць канфлікты паміж людзьмі? Прывядзіце прыклады вядомых вам канфліктаў, якія адбываюцца на планеце. Якая арганізацыя адыгрывае важную ролю ў вырашэнні рэгіянальных і лакальных канфліктаў?

***Для чаго мы гэта вывучаем?*** Чаму ў цяперашні час выклікаюць трывогу ўзнікаючыя канфлікты? Падумайце, чаму з’явіўся новы напрамак у геаграфіі — геаканфліктагогія. Сферай дзейнасці якіх спецыялістаў з’яўляецца вырашэнне рэгіянальных і лакальных канфліктаў?

**Прычыны, класіфікацыя і наступствы канфліктаў у свеце.** Сучасны свет характарызуецца праявай розных канфліктаў паміж дзяржавамі і рэгіёнамі.

***Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў.*** У аснове канфліктаў ляжаць *тры групы фактараў*: лакальныя, рэгіянальныя і глабальныя. *Лакальныя* дзейнічаюць на канкрэтнай тэрыторыі і ў пэўнай краіне. Яны могуць быць звязаны, напрыклад, з асаблівасцямі нацыянальнага складу і гісторыка-культурнага развіцця. *Рэгіянальныя* фактары дзейнічаюць у пэўным рэгіёне ў выніку рознагалоссяў інтарэсаў палітычных, эканамічных аб’яднанняў дзяржаў (напр., НАТА і СНД). *Глабальныя* фактары ўключаюць буйныя палітычныя працэсы ў развіцці сусветнай супольнасці. Напрыклад, крушэнне каланіяльнай сістэмы, сацыялістычнай сістэмы гаспадарання, глабалізацыя.

*Асноўнымі прычынамі* павелічэння колькасці канфліктаў у свеце з’яўляюцца нацыянальна-этнічныя, міжканфесійныя, тэрытарыяльныя, дэмаграфічныя супярэчнасці, але часцей за ўсё іх спалучэнне. Найбольш часта рознагалоссі адбываюцца на этнічнай і міжканфесійнай глебе з імкненнем стварэння новай дзяржавы.

**Сепаратызм — рух за аддзяленне часткі дзяржавы і стварэнне новага дзяржаўнага ўтварэння або за прадастаўленне часткі краіны аўтаноміі па нацыянальных, моўных або рэлігійным прынцыпах.**

Правообладатель Адукацыя і выхаванне




Мал. 15. Класіфікацыя канфліктаў у свеце

Разнастайнасць прычын, маштабаў, форм праяўлення і іншых прыкмет сучасных канфліктаў выклікала неабходнасць іх класіфікацыі. У абагульненай форме віды існуючых у свеце канфліктаў прадстаўлены на малюнку 15.

Канфлікты ў краінах і рэгіёнах свету прыводзяць да негатыўных наступстваў. Сярод іх адрозніваюць верагодныя бліжэйшыя і аддаленыя наступствы.

*Найбольш верагоднымі бліжэйшымі наступствамі* ваенных канфліктаў з'яўляюцца: гібель, траўмы, хваробы; забруджванне навакольнага асяроддзя; псіхалагічнае і інфармацыйнае ўздзеянне; парушэнне кіравання; разбурэнне эканомікі і сістэм жыццезабеспячэння насельніцтва. *Аддаленымі наступствамі* канфліктаў з'яўляюцца: экалагічныя, эканамічныя, медыцынскія, сацыяльныя і дэмаграфічныя.

***Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў.*** Экалагічныя наступствы праяўляюцца ў выглядзе забруджвання навакольнага асяроддзя, знішчэння відавой біялагічнай разнастайнасці, крызісу ў сельскай гаспадарцы і інш. Эканамічныя наступствы — у беднасці і голадзе. Сацыяльныя наступствы — у выглядзе нацыянальнай варожасці, дэфармацыі культуры сям'і і інш. Дэмаграфічныя наступствы — у рэзкім зніжэнні долі мужчынскага насельніцтва і наступных хвалях спаду нараджальнасці.

**Рэгіянальныя і лакальныя канфлікты** характарызуюць маштаб уздзеяння супярэчнасцей. Рэгіянальны канфлікт прадугледжвае ўдзел дзвюх і больш дзяржаў аднаго рэгіёна. Лакальны канфлікт адбываецца, як правіла, паміж дзвюма дзяржавамі і закранае пераважна іх інтарэсы (тэрытарыяльныя, эканамічныя, палітычныя і інш.).

Для кожнага рэгіёна характэрныя як рэгіянальныя, так і лакальныя канфлікты. Частка іх адбываецца ў мірнай/няўзброенай форме, а некаторыя — у форме ўзброенага канфлікту (мал. 16).

У выніку пашырэння інтэграцыі ў Еўропе, якая выступае адносна стабільным рэгіёнам свету, тут застаецца шэраг рэгіянальных канфліктаў. У іх аснове ляжаць

Правообладатель Адукацыя і выхаванне




1. Трыпура, *Індыя*
2. Шан, *Бірма*
3. Таміл-Ілан, *Шры-Ланка*
4. Ачэх, *Інданезія*
5. Паўночны Кейп, *ПАР*

1. Косава
2. Прыднястроўе, *Малдова*
3. Абхазія, *Грузія*
4. Паўднёвая Асеція, *Грузія*
5. Нагорны Карабах, *Азербайджан*
6. Курдыстан, *Турцыя*
7. Курдыстан, *Іран*
8. *Сірыя*
9. Палестына, *Ізраіль*
10. Вазірыстан, *Пакістан*
11. Джаму і Кашмір, *Індыя*
12. Суар, *Кітай*
13. Тыбет, *Кітай*
14. Тайвань, *Кітай*
15. Дэльта Нігера, *Нігер*

1. Паўночная Ірландыя, *Вялікабрытанія*
2. Краіна Баскаў, *Іспанія*
3. Патані, *Тайланд*
4. Паўднёвая Эрытрэя, *Эрытрэя*
5. Самалілэнд, *Самалі*
6. Пунтленд, *Самалі*
7. Цэнтр. шт. Самалі, *Самалі*
8. Галмудуг, *Самалі*
9. Фронт супраціўлення Раханьен, *Самалі*
10. Джубаленд, *Самалі*
11. Дарфур, *Судан*
12. Ківу, *Конга*
13. Бакасі, *Камерун*
14. Ніжняя Конга, *Конга Кіншаса*
15. Кабінда, *Ангола*
16. Сектар Капрыві, *Намібія*

Мал. 16. Лакальныя, рэгіянальныя і глабальныя канфлікты ў свеце

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

сепаратызм, эканамічныя, культурна-рэлігійныя і іншыя прычыны. Прыкладамі лакальных канфліктаў у Еўропе па этнаканфесійных і сацыяльна-эканамічных прычынах з'яўляюцца Каталонія, Краіна Баскаў. Прыкладамі канфліктаў на глебе сепаратызму выступаюць Косава, Чачня, Прыднястроўе, Абхазія, Нагорны Карабах.

**Свет і Беларусь.** Назавіце тэрыторыі, бліжэй за ўсё размешчаныя да меж Рэспублікі Беларусь, дзе сёння працягваюцца рэгіянальныя або лакальныя канфлікты.

*Азія* з другой паловы XX ст. характарызуецца шматлікімі канфліктамі па палітычных і эканамічных прычынах. Асаблівае месца ў рэгіёне займаюць узброеныя канфлікты. Асноўнымі краінамі, дзе яны адбываюцца, з'яўляюцца Ізраіль, Емен, Сірыя (мал. 17), Іран, Ірак, краіны Персідскага заліва і інш. У Азіі адбываюцца канфлікты і на глебе сепаратызму (напр., Курдыстан, Кашмір).



Мал. 17. Наступствы канфлікту ў Сірыі

*Афрыка* ў апошнія дзесяцігоддзі стала самым канфліктанебяспечным рэгіёнам свету. На працягу многіх гадоў балючымі кропкамі рэгіёна з'яўляюцца Самалі, Судан, ДР Конга, Нігерыя, Эфіопія і іншыя краіны. Большасць канфліктаў адбываецца па этнічных і рэлігійных прычынах, на глебе сепаратызму і вырашаецца ўзброеным шляхам.

На канфлікты ў *Амерыцы* найбольшы ўплыў аказалі этнаканфесійны і сацыяльна-эканамічны фактары, часам — сепаратызм. Прыкладамі з'яўляюцца Квебек у Канадзе, Ч'япас у Мексіцы і інш. Нягледзячы на невялікую колькасць лакальных канфліктаў, у Амерыцы захоўваюцца спрэчныя тэрыторыі і межы. Напрыклад, Калумбія і Венесуэла вядуць даўнюю спрэчку аб падзеле тэрытарыяльных вод у Венесуэльскім заліве. У цэлым у параўнанні з іншымі рэгіёнамі канфлікты ў Амерыцы адносна ўрэгуляваныя.

**Узброеныя канфлікты.** Перад светам у XXI ст. стаяць пагрозы міжнароднай бяспекі: 1) распаўсюджванне зброі масавага паражэння; 2) міжнародны тэрарызм, этнічныя і рэлігійныя праблемы; 3) гандаль людзьмі, гвалт і інш. Некаторыя канфлікты не могуць быць вырашаны мірным шляхам і адбываюцца з ваенным умяшаннем. У гэтым выпадку гаворка ідзе пра *ўзброеныя канфлікты*. Яны ўяўляюць з сябе адну з форм вырашэння палітычных, нацыянальна-этнічных, рэлігійных, тэрытарыяльных і іншых супярэчнасцей з прымяненнем сродкаў узброенай барацьбы.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Узброены канфлікт мае *міжнародны* (з удзелам дзвюх і больш дзяржаў) або *ўнутраны характар* (у межах тэрыторыі адной дзяржавы). Вылучаюць тры асноўныя прычыны ўзброеных канфліктаў у свеце (мал. 18).




Мал. 18. Прычыны ўзброеных канфліктаў

***Папрацуем з атласам.*** Выкарыстоўваючы палітычную карту свету, прывядзіце прыклады дзяржаў, дзе маюцца ўзброеныя канфлікты, якія адбываюцца па рэлігійных прычынах, расавай і этнічнай нецярпімасці, а таксама канфлікты, узніклыя на глебе былых каланіяльных меж.

З пачатку 1990-х гг. у свеце адбывалася кароткатэрміновае павелічэнне колькасці ўзброеных канфліктаў.

У 2016 г. іх налічвалася 49: 2 — міждзяржаўныя (паміж Індыяй і Пакістанам і паміж Эрытрэяй і Эфіопіяй), 47 — унутраных (мал. 19). Сярод унутраных канфліктаў каля 40 % адбываецца па палітычных і ідэалагічных прычынах, у тым ліку звязаных з утварэннем самастойных дзяржаў. Кожны трэці ўзброены канфлікт адбываецца на этнічнай або міжканфесійнай глебе.

Афрыка — рэгіён з найбольшай колькасцю канфліктаў (19). Зафіксавана 15 канфліктаў у Азіі, 10 — на Блізкім Усходзе, 3 — у Еўропе і 2 — у Амерыцы. Нягледзячы на тое што ў Азіі і Афрыцы многія канфлікты па-ранейшаму захоўваюцца, у Амерыцы (у прыватнасці ў Калумбіі) атрымліваецца нармалізаваць сітуацыю (мал. 20).

***Паразважаем.*** У многіх раёнах рэгіянальных канфліктаў, дзе ваенныя дзеянні спыніліся, стварылася становішча хутчэй перамір'я, чым трывалага міру. Проста з вострай стадыі яны перайшлі ў стадыю напружаных або патэнцыяльных




Мал. 19. Размеркаванне ўзброеных канфліктаў, %




Мал. 20. Дынаміка ўзброеных канфліктаў у свеце

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

канфліктаў, іншымі словамі, канфліктаў, якія тлеюць. Чым небяспечная такая стадыя? Адказ патлумачце.

Большасць узброеных канфліктаў накіраваны на барацьбу з ісламісцкімі арганізацыямі. 30 % ісламісцкіх канфліктаў адбываецца на Блізкім Усходзе і ў Паўночнай Афрыцы, 30 % — у Афрыцы на поўдзень ад Сахары, астатнія — у Азіі (мал. 21).



**Канфлікты з тэндэнцыяй да абвастрэння**
1. Талібан у Афганістане
2. Грамадзянская вайна ў Сірыі
3. Насілле ў Цэнтральна-Афрыканскай Рэспубліцы
4. Тэрытарыяльныя спрэчкі ў Паўднёва-Кітайскім моры
5. Крызіс вакол Паўночнай Карэі
6. Канфлікт ва Украіне
7. Грамадзянская вайна ў Паўднёвым Судане
8. Курдскі канфлікт
9. Аль-Шабаб у Самалі
10. Канфлікт паміж Індыяй і Пакістанам
11. Вайна ў Емене

**Канфлікты, якія тлеюць**
1. Нагорнакарабахскі канфлікт
2. Ісламісты ў Пакістане
3. Міжабшчынны канфлікт у Ліване
4. Ісламісты ў Егіпце
5. Дэстабілізацыя Малі
6. Насілле ў ДР Конга
7. Міжрэлігійнае насілле у М'янме
8. Напружанасць ва Усходне-Кітайскім моры
9. Вайна супраць ДАІШ у Іраку
10. Ісламісты ў Расіі
11. Крымінал у Мексіцы
12. Ізраільска-палестынскі канфлікт
13. Бока Харам у Нігерыі
14. Грамадзянская вайна ў Лівіі
15. Уйгурскія экстрэмісты ў Кітаі
16. Палітычны крызіс у Бурундзі
17. Крызіс бежанцаў у Еўрапейскім саюзе

Мал. 21. Асноўныя ўзброеныя канфлікты ў свеце, 2016 г.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

***Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў.*** По даных Стакгольмскага міжнароднага інстытута даследавання праблем свету, у 2017 г. асноўнымі краінамі, дзе адбываліся ўзброеныя канфлікты, былі: у Азіі — Афганістан, Індыя, М’янма, Пакістан, Філіпіны; на *Блізкім Усходзе* і ў *Паўночнай Афрыцы* — Егіпет, Ірак, Ізраіль і Палестына, Лівія, Сірыя, Турцыя і Емен; у *Афрыцы* — Малі, Нігерыя, ЦАР, ДР Конга, Эфіопія, Самалі і Паўднёвы Судан; у Еўропе — Нагорны Карабах (канфлікт Арменіі і Азербайджана), Украіна, Грузія (Абхазія і Паўднёвая Асеція), Малдова (Прыднястроўе), Кіпр, Косава; у Амерыцы — Калумбія, Сальвадор, Мексіка, Парагвай.

**Геаканфліктaлогія.** Праблема канфліктаў у свеце прыцягнула ўвагу шматлікіх навуковых дысцыплін. Узаемасувязь паміж канфліктам і яго характарам, з аднаго боку, і геаграфічнай зонай канфлікту, з другога, фарміруе новы напрамак сацыяльна-эканамічнай геаграфіі — геаканфліктaлогію.

**Геаканфліктaлогія — гэта навука, якая вывучае ў адзінстве геаграфічныя, палітычныя і іншыя фактары, што аказваюць уплыў на ўзнікненне, развіццё і зыход палітычных, у тым ліку ўзброеных канфліктаў.**

Найбольш актыўна развіваецца гэты навуковы напрамак у краінах Еўропы.

**Падвядзём вынікі.** На палітычнай карце свету вылучаюць ... і ... канфлікты.
Існуе шэраг прычын узнікнення канфліктаў: ... .
Прыкладам непрызнаных дзяржаў з’яўляецца ... . Квазідзяржава — гэта ... .
Геаканфліктaлогія — новы напрамак у сацыяльна-эканамічнай геаграфіі.
Асноўная роля ў вырашэнні міжнародных канфліктаў належыць ААН.

***Праверым свае веды.*** 1. Якія асноўныя прычыны і віды канфліктаў у свеце? 2. Што такое сепаратызм? 3. Чым адрозніваецца рэгіянальны канфлікт ад лакальнага? 4. Прывядзіце прыклады канфліктаў у Еўропе і Азіі. 5. Якія асноўныя прычыны ўзброеных канфліктаў? Якая іх геаграфія?

***Ад простага да складанага.*** 1. Пра якія ўзброеныя канфлікты вы чулі з інфармацыйных крыніц на працягу апошняга месяца? 2. Выкарыстоўваючы матэрыялы сайта Стакгольмскага міжнароднага інстытута даследавання праблем свету, зрабіце кароткае паведамленне аб прычынах і асаблівасцях узброеных канфліктаў у Азіі.

***Падарожжа па Глабальнай сетцы.***

Сайт Стакгольмскага міжнароднага інстытута даследавання праблем свету.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне




## § 4. Палітычная геаграфія

***Успамінаем.*** Якую інфармацыю вы можаце атрымаць з палітычнай карты свету? Якія асноўныя рысы незалежных дзяржаў? Якія формы кіравання і дзяржаўнага ладу вы можаце назваць для сучасных краін свету?

***Для чаго мы гэта вывучаем?*** Веды якіх вучэбных прадметаў вам сёння будуць неабходныя пры вывучэнні гэтай тэмы? Сферай дзейнасці якіх спецыялістаў з’яўляецца палітычная геаграфія?

**Аб’екты і асноўныя напрамкі палітычнай геаграфіі.** Палітычная геаграфія з’яўляецца адным з важных напрамкаў сацыяльна-эканамічнай геаграфіі і знаходзіцца на стыку навук. Таму шэраг навукоўцаў адводзіць ёй самастойную ролю ў геаграфіі.

Узнікшы ў канцы XVIII ст. як прыродазнаўчая навука, палітычная геаграфія вывучала дзяленне свету на дзяржавы, іх тэрыторыю, узаемнае размяшчэнне, межы і тлумачыла палітычныя працэсы характарам прыродных умоў і ландшафтаў.

***Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў.*** Вядомы французскі асветнік Шарль Луі Мантэск’ё лічыў форму дзяржаўнага кіравання і ладу функцыяй клімату і памераў краіны. Шырокія імперыі схільныя да дэспатычнага кіравання, таму што для стабільнасці ў вялікай па тэрыторыі дзяржаве неабходна, каб аддаленасць месца, куды рассылаюцца загады, ураўнаважвалася хуткасцю іх выканання. Маленькія дзяржавы па сваёй прыродзе павінны быць рэспублікамі, шырокія імперыі — падпарадкоўвацца манарху. Такім чынам, аптымальнай будзе форма дзяржаўнага ладу, якая спалучае перавагі і вартасці рэспубліканскага кіравання з сілай манархіі. Такой формай кіравання Мантэск’ё лічыў федэрацыю — прасторава адзіны саюз суверэнных рэспублік, здольны супрацiўляцца ворагу і захоўваць свае памеры без страты дэмакратыі.

Ці мае рацыю Мантэск’ё? Аргументуйце свае меркаванні «за» і «супраць».

Правообладатель Адукацыя і выхаванне